**УДК 94(476)**

# ЛАТВІЙСКІ НАПРАМАК ПРАЦОЎНАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў ДАКУМЕНТАХ ГАРАДСКОГА СУДА МЯСТЭЧКА ДРУЯ ІІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

***Ю. І. ЗГІРСКІ***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А. В. СУМКО)***

*Абапіраючыся на матэрыялы установы "Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна", праведзены аналіз дакументаў Гарадскога суда Друі Браслаўскага павета (да 1926 г. Дзісненскага павета) Віленскага ваяводства II Рэчы Паспалітай. Аснова матэрыялаў – крымінальныя справы аб парушэнні мяжы за 1930-я гг.*

Пачаткам існавання польска-латвійскай мяжы можна лічыць 1920 г., з моманта ўсталявання часовай мяжы па р. Заходняя Дзвіна. Пасля вырашэння тэрытарыяльнага пытання 1920-х гг., мяжа ў раёне Друі замацавалася па вышэйзгаданай рацэ [6, с. 223—235]. Неабходна адзначыць, што Латвія была адзінай краінай-суседкай на ўсходзе, з якой у Польшчы не было значных канфліктаў і тэрытарыяльных прэтэнзій. Больш за тое, Латвія разглядалася Варшавай як патэнцыяльная саюзніца ў праекце Міжмор'я. Канчаткова, пытанне ўсталявання і рэгулявання стасункаў паміж Латвіяй і Польшчай было вырашана падпісаннем пратакола ў 12 лютага 1929 г. [8, с. 164]. У параўнанні з польска-літоўскай і польска-савецкай мяжой, гэты адрэзак мяжы быў спакойны. На момант 1933 г., Друя з'яўлялася цэнтрам гміны Браслаўскага павета Віленскага ваяводства II Рэчы Паспалітай [7]. З'яўляючыся цэнтрам адміністрацыйна-тэрыятарыяльнай адзінкі, у Друі функцыянаваў Гарадскі суд (польск. Sąd Grodzki), які быў падпарадкаваны Віленскаму акруговаму суду.

Справаводства Гарадскога суда Друі захавалася ў фондах установы "Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна", але нельга казаць аб захаванасці значнай часткі крымінальных спраў праз страту часткі дакументаў пад час падзей 1939 – 1945 гг. Трэба асоба адзначыць асаблівасць значнай часткі дакументаў, выкарыстаных пры даследаванні: пераважная частка дакументаў – анкеты абвінавачаных. Паралельна выкарыстоўваліся дакументы па судовых справах абвінавачаных, але больш інфарматыўнымі сталі менавіта анкеты абвінавачаных. Дзякуючы ім высвятляецца не толькі імя і ўзрост, але і рэлігійная прыналежнасць, нацыянальнасць (заўв. тут трэба адзначыць, што каталікі заўсёды пазначаліся як палякі), асабістыя характарыстыкі (заўв. з 1920-х гг. пачалі выкарыстоўваць і фіксаваць ў анкетах і іншых падобных дакументах пячаткі пальцаў. Але, пры праглядзе дакументаў, у якіх павінны быць пячаткі пальцаў, магчыма адсутнасць апошніх). Пераважна, гэта надрукаваныя на пячатных машынках дакументы, што з'яўляецца характэрнай рысай большасці дакументаў 1930-х гг. Дакументы ранейшага (заўв. 1920-х гг.) перыяду пераважна рукапісныя ці маюць рукапісную частку. Напячатанымі былі і матэрыялы допытаў і, пры захаванасці, тэксты, аўтарства арыштаваных, што тлумачыцца фіксацыяй усіх матэрыялаў падобным чынам (заўв. пячатная машынка). Асновай артыкула з'яўляюцца матэрыялы са звышзгаданага архіва, а таксама матэрыялы вуснай гісторыі з уласнага архіва аўтара. Дзякуючы матэрыялам вуснай гісторыі, існуе магчымасць атрымаць інфармацыю, якая па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах не існуе ў выглядзе дакумента ці ў іншым выглядзе. Пры гэтым, дзякуючы выкарыстанню наратываў і дакументаў разам, з'яўляецца магчымасць разгляду з пазіцый як аўтараў дакумента (заўв. з пазіцыі дзяржаўных органаў міжваеннай Польшчы) так і мясцовага насельніцтва.

Асаблівасцю судоў, якія функцыянавалі ў памежных насельных пунктах з'яўляецца разгляд апошнімі спраў, звязаных з парушэннем мяжы, што вылучала іх на фоне іншых судоў, якія месціліся за межамі памежных гмін і паветаў. Аналізуючы справы аб пераходзе мяжы, можна вылучыць моманты, агульныя для ўсіх спраў падобнага характара:

1) Асноўны напрамак пераходу мяжы (заўв. у асноўным фіксуюцца спробы перахода ў Латвію);
2) Гады спраў;
3) Матывы перахода мяжы;
4) Характарыстыка парушальнікаў (узрост, пол, і г.д.).
5) Канфесійную і нацыянальную прыналежнасць.

Пры аналізе спраў не будуць узгаданы імёны фігурантаў спраў. Мэтай артыкула не з'яўляецца асвятленне інфармацыі біяграфічнага і генеалагічнага характараў.

Як было агучана вышэй, асноўны масіў спраў ахоплівае 1930-е гг. Гэта звязана з захаванасцю толькі часткі спраў. Асноўная колькасць спраў страчана ці знаходзіцца ў фондах іншых архіваў, што выключае высновы аб хвалі эміграцыі, якую можна зрабіць памылкова, не ўлічваючы магчымасці знішчэння, знікнення ці перамяшчэння спраў у перыяд 1939 – 1945 гг.

Узроставая катэгорыя фігурантаў спраў, выкарыстаных у артыкулах, ад 24 да 40 гадоў [3,4,5]. Згодна з матэрыяламі Дзісненскай павятовай камендатуры, асноўнай мерай пакарання за парушэнне мяжы з'яўляецца пазбаўленне волі ў пенітэнцыярнай ўстанове (турме) тэрмінам ад 3 да 6 (заўв. у некаторых выпадках да 12) гадоў [2]. Падобная мера пакарання за парушэнне мяжы распаўсюджана на тэрыторыі ўсёй міжваеннай Польшчы, меры пакарання за парушэнне мяжы былі аднолькавыя для ўсіх рэгіёнаў краіны. Канфесійны склад не характарызуецца аднароднасцю, пры гэтым, прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання запісвалі як палякаў. Колькасная перавага прадстаўнікоў сярод парушальнікаў той ці іншай канфесіі тлумачыцца канфесійным складам і колькасцю прадстаўнікоў ва ўсім павеце. Нацыянальны фактар пры працоўнай эміграцыіі таксама не граў ролі. Галоўную ролю грала матэрыяльнае становішча парушальнікаў. Пры разглядзе латвійскага кірунку трэба выключыць уплыў КПЗБ на абранні Латвіі як транзіту ці месца працоўнай эміграцыі.

У крымінальных справах Гарадскога суда Друі, асноўная катэгорыя парушальнікаў мяжы па роду дзейнасці – земляробы (польск. rolniczy) [3, 4]. Згодна з дакументамі, асноўным матывам пераходу мяжы з'яўляецца пошук працы [3, 4, 5]. На падставе вышэй згаданых фактаў можна зрабіць выснову аб наступным: складаная эканамічная сітуацыя (малазямелле, беззямелле) вымушала працаздольнаую частку насельніцтва (24 – 40 гадоў) шукаць працу за мяжой.

Дадатковым сведчаннем існавання латвійскага кірунку працоўнай эміграцыі з'яўляюцца матэрыялы вуснай гісторыі, сабраныя ў 2022 г.:

*І вот, кагда я с эцім Сымончыкам разгаварывала, Ядзька, сястра наша, у Лепаі* (заўв. Ліепая)*, і як ён узнаў што яна ў Лепаі, яна ж прыяжджала і ён прыхадзіў к нам* (заўв. гаворка ідзе аб сустрэчы ў 2000-х гг.) *і ён сказаў: "Я выязджаў у Амерыку з Лепаі і вазрашчаўся туды". Гродзенцы, да я сагласна, што яны ехалі цераз Літву, цераз Польшчу, можа цераз Гданьск дзе садзіліся… навошта ім ехаць у тое Гродна, Варшаву, калі тут радышкам" [1].*

Паводле наратыва, насельніцтву было вядома пра магчымасць выезду праз Латвію ў Амерыку. Рэспандэнтам адзначана рэгіянальная асаблівасць арыентацыі ў абранні кірункаў эміграцыі. Рэспандэнт, як і асобы, каб якіх ідзе гаворка ў наратыве, жыхары былой Параф'янаўскай гміны (Віленскае ваяводства). Выснова, якую можна зрабіць з аналіза наратыва, аб арыентацыі мясцовага насельніцтва на Латвію патрабуе дадатковага паццвярджэння, але выключаць яе нельга. У наратыве фігуруюць назвы буйных партоў (Гданьск, Ліепая) і яшчэ адзін з пунктаў эмігрцыі (Амерыка), што сведчыць аб транзіце праз Латвію ў іншыя пункты эміграцыі. Цікавым з'яўляецца факт вяртання рэспандэнта назад, што кажа аб сезоннай ці часовай эміграцыяй на заробкі. Зноў жа ж, Латвія выступала як бліжэйшы транзіты пункт, чаму спрыяла палітычнае становішча вакол міжваеннай Польшчы.

На падставе крымінальных спраў Гарадскога суда Друі можна зрабіць выснову аб пераходзе мяжы мясцовым насельніцтвам маладога ўзроста (24-40 гадоў) з мэтай пошуку працы праз малазямелле ці беззямелле, аб чым сведчыць род дзейнасці парушальнікаў – земляробы (польск. rolniczy). Мерай паракання выступала абмежаванне волі на тэрмін ад 3 да 6 гадоў (у некаторых выпадках да 12 гадоў). У матэрыялах вуснай гісторыі фігуруюць сюжэты, у якіх ідзе гаворка аб траніце праз Латвію (латвійскі порт Ліепая) у іншыя пункты эміграцыі. Неабходна адзначыць уплыў палітычнага становішча ва Ўсходняй Еўропе на фармаванне кірункаў працоўнай эміграцыі, адным з каторых, з'ўлялася Латвія. У наратыве ўзгадваецца катэгорыя часовых ці сезонных працоўных эмігрантаў.

На жаль, матэрыялы вуснай гісторыі па гэтай катэгорыі абмяжоўваюцца наратывамі рэспандэнтаў, якія атрымалі гэту інфармацыю ад саміх эмігрантаў ці іх сваякоў/знаёмых. Фіксацыя наратываў ад саміх эмігрантаў немагчыма па аб'ектыўных прычынах, што дататкова паццвярджае неабходнасць выкарыстання матэрыялаў вуснай гісторыі, якія даступныя на сённяшні дзень, з іншымі крыніцамі з мэтай сінтэзу ці адкрыццё фактаў па тэме артыкула.

## ЛІТАРАТУРА

1. Запісана ў 2022 г. Згірскім Ю.І. ад Згірскай Франі Канстанцінаўны 1948 г.н., з в. Курдзекі, Докшыцкага р-н, Віцебскай вобласці (былая Параф'янаўская гміна, Віленскага ваяводства).
2. Дисненская поветовая комендатура государственной полиции Новогрудской окружной комендатуры государственной полиции (с 12.1924 - Новогрудской (с 22.12.1925 - Виленской) воеводской комендатуры государственной полиции, г. Дисна Дисненского повета Новогрудского округа (с 04.02.1921 - Новогрудского воеводства, с 06.04.1922 - Виленского округа, с 22.12.1925 - Виленского воеводства) // Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.509. Оп.1. Д. 50.
3. Друйский городской суд Новогрудского окружного суда, г. Друя Браславского повета Виленского воеводства// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.485. Оп.1. Д. 3.
4. Друйский городской суд Новогрудского окружного суда, г. Друя Браславского повета Виленского воеводства// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.485. Оп.1. Д. 4.

5. Друйский городской суд Новогрудского окружного суда, г. Друя Браславского повета Виленского воеводства// Зональный государственный архив г. Молодечно (ЗГАМол). – Ф.485. Оп.1. Д. 6.
6. Granice i pogranicza. Historia codzienności i doświadczeń/ red. M. Liedke, J. Sadowska, J. Rynkowski. – Białystok: 1999.
7. Główny Urząd Statystyczny w Warszawie: Województwa centralne i wschodnie Rzeczypospolitej Polskiej — podział na gminy według stanu z dnia 1.IV 1933 roku, Książnica-Atlas, Lwów 1933 [Электронный ресурс]. - Режим доступа. - https://rcin.org.pl/dlibra/doccontent?id=32280. – Дата доступа: 02.04.2022.
8. Ochał, A. Tarcza II Rzeczypospolitej. Korpus ochrony pogranicza 1924 - 1939/ Artur Ochał. – Warszawa: Instytut Pamieci Narodowej, 2018. – 440 p.